УДК 94(476):352.075.31«18/19»

**Я. М. Ляпешкін**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# КАНТРОЛЬ ГУБЕРНАТАРАЎ ЗА СЯЛЯНСКІМ САМАКІРАВАННЕМ У БЕЛАРУСІ (1864–1917 ГГ.)

У артыкуле разгледжаны механізм кантролю губернатара за сялянскім самакіраваннем. Паказана, што нагляд ажыццяўляўся праз міравых пасрэднікаў, павятовыя міравыя з'езды (у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях з 1878 г. – праз павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці) і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, а ў пачатку XX ст. – праз земскіх начальнікаў, павятовыя з'езды і губернскія прысутнасці. У сваю чаргу, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці (губернскія прысутнасці), дзе старшынстваваў губернатар, назіралі за іншымі з пералічаных органаў. Адзначана, што гэтыя інстытуты камплектаваліся праз прызначэнні міністра ўнутраных спраў, генерал-губернатара і з удзелам кіраўніка губерні. Зроблена выснова, што ў Беларусі ў механізме нагляду за сялянскім грамадскім кіраваннем губернатару надавалася большае значэнне, чым у цэнтральных расійскіх губернях.

**Ключавыя словы:** губернатар, беларускія губерні, органы нагляду, сялянскае самакіраванне, кантроль.

**Для цытавання:** Ляпешкін Я. М. Кантроль губернатараў за сялянскім самакіраваннем у Беларусі (1864–1917 гг.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 1 (269). С. 16–21. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-3.

**Ya. M. Liapeshkin**
Belarusian State University

# CONTROL OF GOVERNORS OVER PEASANT SELF-GOVERNMENT IN BELARUS (1864–1917)

The article examines the mechanism of the governor's control over peasant self-government. It is shown that supervision was carried out through peace mediators, district peace congresses (in Vitebsk, Mogilev and Minsk provinces from 1878 – district presences for peasant affairs), and provincial presences for peasant affairs, and at the beginning of the 20th century – zemstvo chiefs, district congresses and provincial presences. In turn, the provincial presences for peasant affairs (provincial presences), presided over by the governor, monitored others of the listed bodies. It is noted that these institutions were staffed through the appointments of the Minister of Internal Affairs, the Governor-General and with the participation of the head of the province. It was concluded that the governor was more important in the mechanism of supervision of peasant public administration in Belarus than in the central Russian provinces.

**Keywords:** the governor, Belarusian provinces, supervisory bodies, peasant self-government, control.

**For citation:** Liapeshkin Y. M. Control of governors over peasant self-government in Belarus (1864–1917). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 1 (269), pp. 16–21 (In Belarusian). DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-3.

**Уводзіны.** Установы кіравання па сялянскай справе і ўвогуле дзяржаўны кантроль за органамі сялянскага самакіравання ўжо разглядаліся ў гістарыяграфіі [1–4], але ўвага на ролі губернатара ў беларускіх губернях не акцэнтавалася. Таму для разумення механізму кантролю над вёскай патрэбна звярнуцца да пытання губернатарскага нагляду. Мэта артыкула – раскрыць механізм губернатарскага кантролю над самакіраваннем сялян.

**Асноўная частка.** У выніку аграрнай рэформы 1861 г. былыя прыгонныя сяляне атрымалі права на самакіраванне. У тагачасных крыніцах яно называлася грамадскім кіраваннем. З сялян, якія жылі на зямлі аднаго памешчыка, складалася сельская грамада. А некалькі сельскіх грамад аднаго павета ўтваралі воласць [5, с. 147]. Для грамады стваралася сельскае грамадскае кіраванне, а на ўзроўні воласці існавала валаснае кіраванне.

*Сельскае грамадскае кіраванне* складалася з сельскага сходу і сельскага старасты. Сход загадваў выбарамі службовых асоб, прысуджаў да выдалення шкодных членаў грамадства, хадайнічаў і скардзіўся па грамадскіх справах, выконваў і іншыя функцыі [5, с. 147–148]. *Валаснoе кіраванне* складалася з валаснога сходу, старшыны з праўленнем і сялянскага суда. Валасны

сход фарміраваўся з выбарных асоб. Ён займаўся выбарамі службовых асоб і суддзяў, грамадскай апекай, падачай скаргаў і просьбаў па справах воласці і інш. [5, с. 152]. Аднак сялянскія грамадскія ўстановы падпарадкоўваліся агульнаму губернскаму і павятоваму кіраванню [5, с. 143].

Для рэалізацыі палажэнняў рэформы 1861 г. і разбору спрэчак паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі ўводзіліся пасады міравых пасрэднікаў, павятовыя міравыя з’езды і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці.

*Міравыя пасрэднікі* выбіраліся з мясцовых дваран і зацвярджаліся на пасадзе ўказамі Сената. Прычым спісы кандыдатаў перад зацвярджэннем разглядаліся начальнікам губерні (губернатарам). У абавязкі міравых пасрэднікаў па грамадскім сялянскім кіраванні ўваходзіла зацвярджэнне валаснога старшыны; спагнанні са службовых асоб сельскага і валаснога кіравання за праступкі на пасадзе; адхіленне ад пасады сельскага старасты за сур’ёзныя праступкі; зняцце з пасады валаснога старшыны за службовыя парушэнні (з зацвярджэння губернатара) [6, с. 202–206].

З міравых пасрэднікаў павета і члена ад урада (прызначаўся начальнікам губерні) складаліся *павятовыя міравыя з’езды*, у якіх старшынстваваў павятовы прадвадзіцель дваранства. *Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці* ўзначальваў губернатар. У іх склад уваходзілі губернскі прадвадзіцель дваранства, кіраўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў, губернскі пракурор, чатыры мясцовыя памешчыкі (два з іх запрашаліся з дазволу імператара па ўзгадненні начальніка губерні і міністра ўнутраных спраў і два абіраліся на дваранскіх сходах) [6, с. 213, 216].

Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці займаліся вырашэннем скаргаў на дзеянні міравых пасрэднікаў і павятовыя міравыя з’езды (зацвярджалі ці скасоўвалі рашэнне па скарзе), добраахвотнымі пагадненнямі сялян з памешчыкамі, распарадчымі дзеяннямі па сялянскіх справах. Калі начальнік губерні сустракаў цяжкасці ў выкананні рашэння губернскай прысутнасці (пры абставінах, якія заслугоўвалі ўвагі ўрада), то ён меў права яго прыпыніць. Пра што даносіў міністру ўнутраных спраў [6, с. 217–218].

З дадзенага агляду заканадаўства можна зрабіць выснову, што адносіны сялян і сялянскага самакіравання з памешчыкамі рэгулявалі створаныя органы ўлады: міравыя пасрэднікі, павятовыя міравыя з’езды і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці. Апошнія, у сваю чаргу, кантралявалі міравых пасрэднікаў і з’езды, разглядаючы на іх скаргі.

У той жа час губернатар непасрэдна не кантраляваў сялянскае самакіраванне. Але ён ажыццяўляў нагляд за ім з дапамогай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, дзе ён старшынстваваў.

На практыцы гэта выглядала наступным чынам. Па інфармацыі міравога пасрэдніка Гродзенскай губерні Славуцінскага С. Ц., у 1866 г. губернатар Скварцоў І. М. (1863–1868) наведаў некалькі валасных праўленняў Гродзенскага павета. У выніку агляду ім былі вынесены на разгляд губернскай прысутнасці заўвагі. Яны ўказвалі на няправільную працу валасных сходаў і няведанне сялянскімі службовымі асобамі сваіх абавязкаў [7, с. 293].

Падобныя рэвізіі праводзіліся і ў Мінскай губерні. Так, у 1865 г. губернатар Шалгуноў П. Н. (1864–1868) аб’ехаў воласці Барысаўскага павета і накіраваў губернскай прысутнасці заўвагі, зробленыя па валасным кіраванні. Прысутнасць, у сваю чаргу, прыняла пастанову па выпраўленні выяўленых недахопаў [8, арк. 25, 30 зв., 33–35].

Між тым, па словах М. К. Палявога, які працаваў міравым пасрэднікам у Мінскай губерні ў 1864–1865 гг., старшыня губернскай прысутнасці Шалгуноў П. Н. не быў знаёмы з сялянскай справай. Таму ён і не кіраваў ёй [8, с. 10, 21]. Хаця начальнік губерні не абавязкова мог разбірацца ў сялянскай справе, але фармальна ён усё ж з’яўляўся старшынёй губернскай прысутнасці, а значыць, з ім трэба было лічыцца.

Паўстанне 1863–1864 гг. унесла істотныя змены ў сістэму кіравання сялянскай справай. Так, у 1863 г. віленскі генерал-губернатар атрымаў часовае права звальняць ад пасад міравых пасрэднікаў, валасных старшын і сельскіх старастаў, якіх ён лічыў нядобранадзейнымі. Прычым на вакантныя пасады міравых пасрэднікаў замест абрання сталі прызначацца кандыдаты па рашэнні генерал-губернатара, а пасады валасных старшын і сельскіх старастаў замяшчаліся пасля новых выбараў [10, с. 209]. Такім чынам, мясцовыя міравыя пасрэднікі сталі больш залежнымі ад адміністрацыі.

У падборы гэтых асоб пры генерал-губернатары Мураўёве М. М. (1863–1865) канчатковае рашэнне было за ім. Роля губернатараў у гэтым аспекце адыходзіла на другі план: «…ніякія прадстаўленні і хадайніцтвы губернатараў аб звальненні таго ці іншага пасрэдніка не мелі ніякіх вынікаў, калі былі заснаваныя толькі на адным жаданні пазбавіцца ад пасрэдніка…» [11, с. 226], – прыгадваў ва ўспамінах міравы пасрэднік Бярэзін У. П. Такі падыход, верагодна, захоўваўся і пры наступных генерал-губернатарах – К. П. фон Каўфмане (1865–1866) і графе Э. Т. Баранаве (1866–1868) [11, с. 226]. Таму пры фарміраванні інстытута міравых пасрэднікаў у 1863–1868 гг. галоўная

роля адводзілася главе Віленскага генерал-губернатарства, а начальнікі губерняў не мелі вырашальнага значэння.

Між тым сістэма кардынальна змянілася з прызначэннем генерал-губернатарам Патапава А. Л. (1868–1874). Ён «у справе прызначэння і звальнення пасрэднікаў кіраваўся выключна жаданнямі губернатараў» [11, с. 226], – пісаў сучаснік. Значыць, міравыя ўстановы траплялі ў большую залежнасць ад губернатара.

Пад уплывам паўстання 1863–1864 гг. у беларускіх губернях асобы на выбарныя пасады ў губернскія па сялянскіх справах прысутнасці таксама сталі прызначацца (у адрозненне ад унутраных расійскіх рэгіёнаў). Прычым улічвалася іх праваслаўнае веравызнанне і «рускае» паходжанне [2, арк. 9]. Напрыклад, у 1863 г. на дзве выбарныя пасады ад дваранства ў Гродзенскай прысутнасці былі прызначаны Міністэрствам унутраных спраў (МУС) праваслаўныя памешчыкі [2, арк. 65].

Пераўтварэнні органаў кіравання па сялянскіх справах працягвалі адбывацца і надалей. Так, у 1874 г. урад з мэтай скарачэння выдаткаў земстваў пайшоў на скасаванне пасады міравых пасрэднікаў. Гэтыя перамены закранулі тыя губерні, дзе былі ўведзены земскія і міравыя судовыя ўстановы па рэформе 1864 г. Абавязкі пасрэднікаў ускладаліся на *павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці*, іх неадменных членаў і агульныя ўстановы. У выніку ў кожным павеце ўтвараліся павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці. Яны складаліся са старшыні – павятовага прадвадзіцеля дваранства, неадменнага члена, павятовага спраўніка, старшыні павятовай земскай управы, ганаровага міравога суддзі. На пасаду неадменнага члена губернскі земскі сход выбіраў па два кандыдаты. Зацвярджэнне на пасаду, пасля водзыву губернатара, рабіў кіраўнік МУС [12, с. 929–930].

Павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці зацвярджалі валасных старшын, накладалі спагнанні на службовых асоб сялянскага кіравання, назіралі за ходам апошняга, рэвізавалі валаснае і сельскае кіраванне [12, с. 930–931]. Гэта сведчыць пра ўзмацненне кантролю за сялянскім насельніцтвам з боку ўлады.

У Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях пасаду міравых пасрэднікаў скасавалі ў 1878 г. (перасталі дзейнічаць і іх з’езды). Замест іх уводзіліся павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці. Губернатар надзяляўся правам, у выпадку неабходнасці, прызначаць трох членаў са службовых асоб, якія будуць удзельнічаць у пасяджэннях павятовай па сялянскіх справах прысутнасці. Неадменных членаў павятовых прысутнасцяў прызначаў міністр унутраных спраў па прадстаўленні губернатара [13, с. 225]. Такім чынам, у трох беларускіх губернях новыя ўстановы трапілі ў большую залежнасць ад начальніка губерні, чым у земскіх рэгіёнах.

Таксама ў Магілёўскай губерні, дзе раней дзейнічаў агульны з’езд міравых пасрэднікаў, цяпер па выбары губернатара з прадвадзіцеляў дваранства прызначаўся агульны для павятовых прысутнасцяў старшыня. Яго зацвярджаў кіраўнік МУС [13, с. 226]. А з 1888 г. замест агульнага старшыні тут у кожнай павятовай прысутнасці павінен быў старшынстваваць павятовы прадвадзіцель дваранства [14, с. 301].

Акрамя таго, справаводства павятовых па сялянскіх справах прысутнасцяў рэвізавалася губернатарам. Напрыклад, у 1893 г. начальнік Віцебскай губерні князь Далгарукаў В. М. (1884–1894) праверыў справаводства такіх устаноў, а выпраўляць выяўленыя хібы прапанаваў ужо губернскай па сялянскіх справах прысутнасці [15, арк. 1–2].

У Віленскай і Гродзенскай губернях з 1888 г. аднавілі з’езды міравых пасрэднікаў для кожнага павета пад старшынствам прадвадзіцеляў дваранства [14, с. 301]. А інстытут міравых пасрэднікаў тут захаваўся да канца 1903 г. [1, с. 162]. На змену ім прыйшлі земскія начальнікі [3, арк. 26, 35].

З улікам таго, што ў Беларусі дваранскія выбары не былі адноўлены, з’езды міравых пасрэднікаў і павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці знаходзіліся ў значна большай залежнасці ад МУС і губернатара ў параўнанні з унутранымі расійскімі губернямі, дзе дваранскія выбары праводзіліся.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў Віленскай і Гродзенскай губернях захоўваўся моцны ўплыў генерал-губернатара. Так, у справаздачы П. П. Альбядзінскага (1874–1880) імператару за 1874–1877 гг. дакладвалася пра выяўленыя, падчас аб’езду краю, недахопы і ўказвалася на «неабходнасць узмацніць назіранне за дзеяннямі міравых пасрэднікаў і каморнікаў, якія знаходзяцца ў іх распараджэнні» [16, арк. 83 зв.]. Таму генерал-губернатар прапанаваў губернатарам «устанавіць тэрміновыя паверкі работ па адмежаванні праз членаў губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцяў і паверачных каморнікаў...» [16, арк. 83 зв. – 84]. Паводле яго слоў, прынятыя меры паскорылі працы па адмежаванні сялянскага і памешчыцкага землеўладання ў краі [16, арк. 84]. Значыць, тут у дзеянні губернатараў па сялянскай справе актыўна ўмешваўся генерал-губернатар.

Праца павятовых па сялянскіх справах прысутнасцяў аказалася недасканалай [1, с. 230]. Да таго ж захоўвалася неспакойная грамадска-палітычная сітуацыя. Таму ўрад прапанаваў

новую структуру для кіравання ў сельскай мясцовасці. Яна знайшла адлюстраванне ў Палажэнні аб земскіх участковых начальніках ад 12 ліпеня 1889 г. Згодна з дакументам, кантроль з боку дзяржаўнай улады над сялянскім самакіраваннем узмацняўся. Новыя заканапалажэнні першапачаткова ўводзіліся ў больш надзейных унутраных губернях, а затым распаўсюджваліся на памежныя рэгіёны краіны. У губернях, на якія распаўсюджвалася Палажэнне ад 12 ліпеня 1889 г., замест губернскіх і павятовых па сялянскіх справах прысутнасцяў пачалі ўладкоўвацца *земскія ўчастковыя начальнікі, павятовыя з'езды і губернскія прысутнасці* [17, с. 510, 517, 521].

Земскі начальнік надзяляўся правам нагляду за сялянскім самакіраваннем, правядзення рэвізій сялянскіх грамадскіх устаноў на сваё меркаванне ці па даручэнні губернскай прысутнасці або губернатара. Апошнія ажыццяўлялі нагляд над земскім начальнікам і яго кіраўніцтвам [17, с. 513, 517]. Губернатар разам з губернскім і павятовым прадвадзіцелямі дваранства выбіраў кандыдата на пасаду земскага начальніка, якога зацвярджаў глава МУС [17, с. 512].

Па законе ад 12 ліпеня 1889 г. у кожным павеце ўтвараўся павятовы з'езд, які складаўся з адміністрацыйнай і судовай прысутнасцяў. У першай старшынстваваў павятовы прадвадзіцель дваранства. У яе склад уваходзілі ўсе земскія начальнікі павета, спраўнік і старшыня павятовай земскай управы. Судовая прысутнасць пад старшынствам павятовага прадвадзіцеля дваранства складалася з павятовага члена акруговага суда, ганаровых міравых суддзяў, гарадскіх суддзяў і земскіх начальнікаў [17, с. 517–518].

У мясцовасцях, дзе дваранскія выбары не праводзіліся, у тым ліку і ў Беларусі, старшыні павятовых з'ездаў прызначаліся кіраўніком МУС па прадстаўленні губернатара [17, с. 518]. Земскія начальнікі прызначаліся таксама міністрам у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а ў Віленскай і Гродзенскай – генерал-губернатарам, па прадстаўленнях губернатараў [18, с. 369]. Таксама па прапанове начальніка губерні павятовы з'езд уносіў у губернскую прысутнасць запыт аб канчатковым выдаленні з пасады службовых асоб сельскага і валаснога ўпраўлення ці перадачы іх суду [17, с. 519].

У губернях, дзе ўводзіўся закон ад 12 ліпеня 1889 г., губернскія і павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці скасоўваліся. Адміністрацыйныя абавязкі першых перадаваліся губернскай прысутнасці [17, с. 521, 534]. У новай установе старшынстваваў губернатар. У яе склад уваходзіў губернскі прадвадзіцель дваранства, віцэ-губернатар, пракурор ці яго таварыш, два неадменныя члены. Губернская прысутнасць ажыццяўляла нагляд за выкананнем абавязкаў земскімі начальнікамі і павятовымі з'ездамі, праводзіла рэвізіі іх справаводства. Губернатар меў права спыняць выкананне пастановы губернскай прысутнасці па адміністрацыйным пытанні, перадаўшы справу на вырашэнне міністру ўнутраных спраў [17, с. 521–523]. У мясцовасцях, дзе ўводзіўся Закон ад 12 ліпеня 1889 г., начальнік губерні мог звальняць з пасад службовых асоб валаснога і сельскага кіравання з-за парушэння імі сваіх абавязкаў. Толькі адхіленне з пасады валаснога старшыны вырашалася на пасяджэнні губернскай прысутнасці [17, с. 509]. Так, значна раней, у 1865 г. Мінская губернская прысутнасць, з улікам заўвагі губернатара Шалгунова П. Н., для «выпраўлення парадку і належнага напрамку сялян Лагойскай воласці», вырашыла адхіліць старшыну ад пасады [8, арк. 33 зв.].

У Беларусі законапалажэнні ад 12 ліпеня 1889 г. пачалі ўводзіцца са спазненнем на 12–14 гадоў. У 1901 г. губернскія прысутнасці, павятовыя з'езды і земскія начальнікі з'явіліся ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а ў 1903 г. – у Віленскай і Гродзенскай. Адтэрміноўка ў рэфармаванні мясцовага кіравання сялянскай справай у беларускіх губернях тлумачыцца небяспекай, якую ўяўляла перадача ўладных паўнамоцтваў земскім начальнікам. На такую пасаду тут маглі трапіць мясцовыя землеўладальнікі, у тым ліку каталіцкага веравызнання [1, с. 213, 237, 239–240, 293, 302–304].

У далейшым рэфармаванне мясцовых органаў кіравання сялянскай справай было звязана са Сталыпінскай аграрнай рэформай. Яе прычыны заключаліся ў нявырашанасці зямельнага пытання і росце ў сувязі з гэтым рэвалюцыйнага настрою ў вёсцы. Мэта рэформы палягала ў стварэнні праслойкі сельскіх заможных уласнікаў, якая б стала апорай дзяржаўнай улады ў сельскай мясцовасці.

Па ўказе ад 9 лістапада 1906 г., якім распачалася рэформа, сяляне атрымалі права пераходу ад абшчыннага валодання зямлёю да асабістага, з замацаваннем надзелу ў прыватную ўласнасць [19, с. 970–971]. У выніку разбурэння абшчыны ўзрастала роля сялянскага самакіравання і органаў нагляду за ім. Яшчэ раней, указам ад 4 сакавіка 1906 г. для садзейнічання Сялянскаму банку ў куплі-продажы зямлі сялянам, ствараліся *губернскія і павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі* [20, с. 199]. На губернскія камісіі (іх узначальваў губернатар) ускладаўся нагляд за дзейнасцю павятовых камісій. Апошнія вызначалі мэтазгоднасць набыцця зямлі Сялянскім банкам, выяўлялі яе вартасць, патрэбу ў ёй сялян [20, с. 200]. Мінская, Віцебская і Магілёўская губернскія землеўпарадкавальныя камісіі былі ўтвораны ў 1907 г.

У Віленскай і Гродзенскай губернях землеўпарадкаванне часова ўскладалася на губернскія прысутнасці. Павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі былі арганізаваны па ўсёй Беларусі на працягу 1906–1907 гг. [4, арк. 50–51].

Органы нагляду (земскія начальнікі, павятовыя з'езды і губернскія прысутнасці) за сялянскім грамадскім кіраваннем, як і інстытут губернатарства, без значных змен праіснавалі да 1917 г. [1, с. 333; 21, с. 337].

**Заключэнне.** Кантроль за сялянскім самакіраваннем з 1860-х гг. ажыццяўляўся ў Беларусі праз міравых пасрэднікаў, павятовыя міравыя з'езды (з 1878 г. – у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях праз павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці, на 4 гады пазней, чым у цэнтральных рэгіёнах імперыі) і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, а ў пачатку XX ст. (па законе ад 12 ліпеня 1889 г.) – праз земскіх начальнікаў, павятовыя з'езды і губернскія прысутнасці (з 1901 г. – у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, з 1903 г. – у Віленскай і Гродзенскай, на 12–14 гадоў пазней, чым у земскіх губернях). У сваю чаргу, начальнік губерні кантраляваў самакіраванне праз старшынства ў губернскай па сялянскіх справах прысутнасці (губернскай прысутнасці); рэвізіі валаснога кіравання і справаводства органаў па сялянскіх справах; спыненне выканання пастаноў губернскай прысутнасці (даносячы пра тое ў МУС); звальненне з пасад службоўцаў валаснога і сельскага кіравання з-за парушэння імі сваіх абавязкаў (адхіленне з пасады валаснога старшыны вырашалася на пасяджэнні губернскай прысутнасці).

Мясцовыя органы ўлады, праз якія губернатар кантраляваў самакіраванне ў беларускіх вёсках, камплектаваліся праз прызначэнні кіраўніка МУС, генерал-губернатара і з удзелам губернатара. Ва ўнутраных расійскіх губернях гэтыя інстытуты мелі абмежаваную выбарнасць. Таму ў Беларусі ў механізме нагляду за сялянскім грамадскім кіраваннем губернатар меў большы уплыў.

## Спіс літаратуры

1. Талмачова С. А. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.). Мінск: БДПУ, 2019. 342 с.

2. Долгач Т. В. Губернские по крестьянским делам присутствия на территории Беларуси: формирование, структура, деятельность (1861–1903 гг.): дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 2019. 200 л.

3. Страленя А. А. Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.): дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 2017. 169 л.

4. Таранович К. Ю. Деятельность землеустроительных комиссий по реализации столыпинской аграрной реформы в Беларуси (1906–1917 гг.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 2016. 239 л.

5. Полное собр. законов Российской империи (ПСЗРИ). Собр. 2: в 55 т. СПб., 1863. Т. 36, отд-ние 1, № 36657. С. 141–169.

6. ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. СПб., 1863. Т. 36, отд-ние 1, № 36660. С. 202–218.

7. Славутинский С. Т. Город Гродно и Гродненская губерния во время последнего польского мятежа (Отрывок из воспоминаний) // Исторический вестник. 1889. Т. 37. С. 53–79, 271–295.

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 242. Воп. 1. Спр. 643.

9. Полевой Н. Два года, 1864 и 1865, из истории крестьянского дела в Минской губ. // Русская старина. 1910. № 1. С. 47–63; № 2. С. 247–270; № 4. С. 3–25.

10. ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. СПб., 1866. Т. 38, отд-ние 1, № 39354. С. 209.

11. Березин В. Восемь лет в Северо-Западном крае // Русский вестник. 1896. № 1–2. С. 139–157; № 3–4. С. 170–180; № 7. С. 185–204; № 11. С. 211–256.

12. ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. СПб., 1876. Т. 49, отд-ние 1, № 53678. С. 929–934.

13. ПСЗРИ. Собр. 2: в 55 т. СПб., 1880. Т. 53, отд-ние 1, № 58352. С. 225–226.

14. ПСЗРИ. Собр. 3: в 33 т. СПб., 1890. Т. 8, № 5281. С. 301.

15. НГАБ. Ф. 2642. Воп. 1. Спр. 1379.

16. Аддзел рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Ф. 16. Адз. зах. 51.

17. ПСЗРИ. Собр. 3: в 33 т. СПб., 1891. Т. 9, № 6196. С. 508–535.

18. ПСЗРИ. Собр. 3: в 33 т. СПб., 1907. Т. 24, отд-ние 1, № 24388. С. 368–371.

19. ПСЗРИ. Собр. 3: в 33 т. СПб., 1909. Т. 26, отд-ние 1, № 28528. С. 970–974.

20. ПСЗРИ. Собр. 3: в 33 т. СПб., 1909. Т. 26, отд-ние 1, № 27478. С. 199–201.

21. Бригадин П. И., Лукашевич А. М. Минские губернаторы: история власти. Минск: Гос. ин-т упр. и соц. технологий Белорус. гос. ун-та, 2009. 351 с.

## References

1. Talmachova S. A. *Myastsovyya organy dzyarzhaunaga kiravannya pa realizatsyi agrarnay palityki samadzyarzhauya na terytoryi Belarusi (1861–1914 gg.)* [Local government bodies implementing the agrarian policy of the autocracy on the territory of Belarus (1861–1914)]. Minsk, BDPU Publ., 2019. 342 p. (In Belarusian).

2. Dolgach T. V. *Gubernskiye po krest'yanskim delam prisutstviya na territorii Belarusi: formirovaniye, struktura, deyatel'nost' (1861–1903 gg.). Dissertatsiya kandidata istoricheskikh nauk* [Provincial on peasant affairs of presence on the territory of Belarus: formation, structure, activity (1861–1903). Dissertation PhD (History)]. Minsk, 2019. 200 p. (In Russian).

3. Stralenya A. A. *Deyatel'nost' zemskikh nachal'nikov na territorii Belarusi (konets XIX v. – 1914 g.). Dissertatsiya kandidata istoricheskikh nauk* [Activity of zemstvo chiefs on the territory of Belarus (end of the 19th century – 1914). Dissertation PhD (History)]. Minsk, 2017. 169 p. (In Russian).

4. Taranovich K. YU. *Deyatel'nost' zemleustroitel'nykh komissiy po realizatsii stolypinskoy agrarnoy reformy v Belarusi (1906–1917 gg.) Dissertatsiya kandidata istoricheskikh nauk* [Activities of land management commissions for the implementation of the Stolypin agrarian reform in Belarus (1906–1917). Dissertation PhD (History)]. Minsk, 2016. 239 p. (In Russian).

5. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii* (PSZRI) [Complete collection of laws of the Russian Empire (CCLRE)]. St. Petersburg, 1863, vol. 36, department 1, no. 36657, pp. 141–169 (In Russian).

6. CCLRE. St. Petersburg, 1863, vol. 36, department 1, no. 36660, pp. 202–218 (In Russian).

7. Slavutinskiy S. T. The city of Grodno and the Grodno province during the last Polish rebellion. *Istoricheskiy vestnik* [Historical Bulletin], 1889, vol. 37, pp. 53–79, 271–295 (In Russian).

8. National Historical Archives of Belarus (NHAB). Fund 242. I. 1. F. 643.

9. Polevoy N. Two years – 1864 and 1865, from the history of peasant affairs in the Minsk province. *Russkaya starina* [Russian antiquity], 1910, no. 1, pp. 47–63; no. 2, pp. 247–270; no. 4, pp. 3–25 (In Russian).

10. CCLRE. St. Petersburg, 1866, vol. 38, department 1, № 39354, p. 209 (In Russian).

11. Berezin V. Eight years in the North-Western Territory. *Russkiy vestnik* [Russian Bulletin], 1896, no. 1–2, pp. 139–157; no. 3–4, pp. 170–180; no. 7, pp. 185–204; no. 11, pp. 211–256 (In Russian).

12. CCLRE. St. Petersburg, 1876, vol. 49, department 1, no. 53678, pp. 929–934 (In Russian).

13. CCLRE. St. Petersburg, 1880, vol. 53, department 1, no. 58352, pp. 225–226 (In Russian).

14. CCLRE. St. Petersburg, 1890, vol. 8, № 5281, p. 301 (In Russian).

15. NHAB. Fund 2642. I. 1. F. 1379.

16. Department of manuscripts of the Russian National Library. Fund 16. St. un. 51.

17. CCLRE. St. Petersburg, 1891, vol. 9, № 6196, pp. 508–535. (In Russian).

18. CCLRE. St. Petersburg, 1907, vol. 24, department 1, no. 24388, pp. 368–371 (In Russian).

19. CCLRE. St. Petersburg, 1909, vol. 26, department 1, no. 28528, pp. 970–974 (In Russian).

20. CCLRE. St. Petersburg, 1909, vol. 26, department 1, no. 27478, pp. 199–201 (In Russian).

21. Brigadin P. I., Lukashevich A. M. *Minskiye gubernatory: istoriya vlasti* [Minsk governors: the history of power]. Minsk, Gos. in-t upr. i sots. tekhnologiy Belorus. gos. un-ta Publ., 2009. 351 p. (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Ляпешкін Яўген Мікалаевіч** – магістр гістарычных навук, саіскальнік кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, Рэспубліка Беларусь). E-mail: Lia.Yauhen@gmail.com

## Information about the author

**Liapeshkin Yauhen Mikalaevich** – Master of Historical Sciences, External doctorate student, the Department of History of Belarus of the New and Modern Times. Belarusian State University (4, Nezalezhnastsi Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: Lia.Yauhen@gmail.com

*Паступіў 27.02.2023*